Парадак дня

# НА САМЫМ ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

**Да XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі засталося крыху больш за месяц, а значыць, Полацк, Наваполацк і Віцебск выходзяць на фінішную прамую ў падрыхтоўцы да міжнароднага мерапрыемства. Учора Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА з рабочым візітам наведала самы старажытны горад Беларусі, каб ацаніць ступень гатоўнасці яго аб'ектаў.**



*Першым пунктам маршруту* старшыні і членаў Савета Рэспублікі стаў будынак былога Дома афіцэраў, капітальная рэканструкцыя якога пачалася яшчэ летам мінулага года. Помнік архітэктуры ў стылі сталінскага ампіру перажывае трэцяе нараджэнне. На поўнае аднаўленне будынка, у якім будуць размешчаны ваенная кафедра і творчыя факультэты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай, накіравана каля 13 мільёнаў рублёў. Будаўнічыя работы выконваюцца сіламі ААТ «Гравеліт», але і самі студэнты ПДУ шчыруюць на карысць новага корпуса альма-матар.

Падчас наведвання аб'екта Наталля Качанава паразмаўляла са студэнткамі трэцяга курса будаўнічага факультэта, якія задзейнічаны ва ўнутраных работах, і выказала словы падзякі моладзі за ўклад у агульную справу краіны. Гістарычна сцены ў Доме афіцэраў былі насычанага жоўтага колеру, такую гаму з акцэнтнымі аліўкавымі тонамі пастараліся захаваць. З нуля аднаўлялі ляпніну. Канчатковы вонкавы выгляд будынак набудзе праз паўтара тыдня. Наталля Іванаўна засяродзіла ўвагу на тым, што падчас *афарбоўкі калон і фасадаў* варта абраць светлыя колеры, каб новы корпус удала спалучаўся з суседнім будынкам райвыканкама. «Я вас вельмі прашу: рабіце фасады ў светлых тонах. Калі пафарбаваць калоны ў цёмны, будзе катастрофа. Сустракаемся праз месяц на здачы ў эксплуатацыю», — звярнулася яна да падрадчыкаў.

Пляцоўка ААТ «Белаграпрамбанк» будзе задзейнічана для арганізацыі работы секцыі № 2 «Развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва як найважнейшы кірунак забеспячэння паступовага развіцця Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі». Наталля Качанава, старшыні Віцебскага аблвыканкама і абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Субоцін і Дзмітрый Дзямідаў, старшыня Полацкага райвыканкама Ігар Марковіч ацанілі ход падрыхтоўкі. На ніжнім паверсе *банка плануюць арганізаваць кава*брэйк, на другім — секцыю. Намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па эканоміцы Аляксандр Каладынскі прэзентаваў падрыхтаваную да форуму друкаваную прадукцыю, у ліку якой — каталог аграсядзіб паўночнага рэгіёна. Наталля Качанава заўважыла, што гэта пляцоўка *амаль гатова прымаць* удзельнікаў міжнароднага форуму і падзякавала кіраўніцтву Белаграпрамбанка за плённае супрацоўніцтва з Беларускім саюзам жанчын, у выніку якога быў запушчаны важны інклюзіўны праект.

Полацкае кадэцкае вучылішча таксама будзе прымаць гасцей. Дырэктар установы Станіслаў Красоўскі паказаў парламентарыям прыкладны экскурсійны маршрут і відэафільм, у якім бралі ўдзел маясцовыя кадэты. Пасля азнаямлення з дзейнасцю і гісторыяй установы ўдзельнікаў форуму плануюць запрасіць на ўрачыстую цырымонію перадачы сцяга. «Трэба адпрацаваць два варыянты правядзення цырымоніі: у будынку і на вуліцы, зыходзячы з таймінгу. Вы павінны разумець, што ў *Полацку вельмі многа славутасцяў*, таму я хачу як мага шырока пазнаёміць Валянціну Іванаўну Матвіенка з гісторыяй нашай краіны», — акцэнтавала ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі і падкрэсліла, што трэба адвесці час, каб ганаровыя госці змаглі паразмаўляць з кадэтамі.

Яшчэ адзін аб'ект, які закране форум, — Сафійскі сабор. Цяпер музей гісторыі архітэктуры зачынены на рэстаўрацыйна-рамонтныя работы. З сярэдзіны сакавіка пачалося добраўпарадкаванне набярэжнай Заходняй Дзвіны паблізу святыні. Падчас наведвання аб'екта Наталля Качанава адзначыла, што гасцям трэба паказаць не толькі гісторыю помніка архітэктуры XVIII стагоддзя, але і прапанаваць спусціцца ўніз, дакрануцца да XI стагоддзя — фрагментаў кладкі і фрэскавага роспісу тых часоў. У планах — таксама прадэманстраваць кампазіцыі на аргане.

Падчас перамяшчэння па Полацку старшыня Савета Рэспублікі звяртала ўвагу на азеляненне гарадскіх тэрыторый, якое павінна быць праведзена на найвышэйшым узроўні, рэкламу, размешчаную на білбордах. Вялікая ўвага — адпаведнасці назваў аб'ектаў грамадскага харчавання і адпачынку гісторыі горада. «Яшчэ раз трэба паглядзець, каб невялічкія кафэ называліся прыгожа, а не, напрыклад, «На раёне». Полаччына — гэта наша турыстычная Мекка: куды ні стань — усюды гісторыя. Гэта мы і павінны папулярызаваць, рабіць брэндам», — падкрэсліла старшыня палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва.

*Апошнім пунктам маршруту стаў* Спаса-Ефрасіннеўскі стаўрапігіяльны жаночы манастыр. Жамчужынай комплексу з'яўляецца Спаса-Праабражэнская царква, аб'ект мае найвышэйшую катэгорыю ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі і ўваходзіць у дзяржаўную інвестыцыйную праграму і комплекс мер па развіцці Полацкага раёна да 2025 года. Пасля завяршэння рэстаўрацыйных работ царква звонку будзе мець выгляд храма XIX стагоддзя, унутры — XII.

«Мы будзем імкнуцца зрабіць усё магчымае, каб работа секцый і пленарнае пасяджэнне далі станоўчы вынік і эфект для супрацоўніцтва нашых краін. Вы ведаеце, якая ўвага сёння ўдзяляецца імпартазамяшчэнню, інавацыйнаму развіццю Беларусі. Таму гэта будзе запамінальная падзея для нашых гасцей і *беларускай грамадскасці*. Мы хочам паказаць гісторыю нашай краіны, яе карані. Менавіта таму для правядзення форуму абраны ў тым ліку і горад Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці. Нам ёсць што паказаць. З года ў год яго славутасці, гістарычныя каштоўнасці не толькі захоўваюцца, але і набываюць новы выгляд. Сёння нават тыя будынкі, якія даўно не былі ў эксплуатацыі, атрымліваюць другое нараджэнне. Упэўнена, што XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі пройдзе ярка, на самым высокім узроўні», — заключыла Наталля Качанава.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

*г. Полацк.*